**Н.І. Грышчанка** (ДУА “Полацкая дзяржаўная гімназія № 1 імя Францыска Скарыны”)

# ВЫКАРЫСТАННЕ ФАЛЬКЛОРНАГА МАТЭРЫЯЛУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК СРОДАК ПАВЫШЭННЯ ЦІКАВАСЦІ ДА ПРАДМЕТА

***Ключавыя словы:*** фальклор, арфаграфічная пільнасць, пунктуацыйная граматнасць, чытацкая граматнасць, духоўна-маральнае выхаванне.

Адной з задач навучання беларускай мове з’яўляецца далучэнне дзяцей праз мову да культурных традыцый беларускага народа. Прыказкі, прымаўкі, песні, загадкі, прыкметы, смяшынкі, скорагаворкі як жанры вуснай народнай творчасці, дапоўненыя разнастайнымі заданнямі, даюць вялікую магчымасць для больш эфектыўнай работы на ўроках, прычым яны нясуць яшчэ і выхаваўчую, і займальную функцыі.

Абавязковы этап кожнага ўрока беларускай мовы – правядзенне арфаграфічнай хвілінкі. Гэта і паўтарэнне правапісу, і ўменне ўбачыць у слове названую арфаграму. А можна разнастаіць гэты від працы і зрабіць так, каб з устаўленых (падкрэсленых) літар атрымаліся словы, з якіх неабходна скласці прымаўку, што паслужыць дэвізам урока. Вучням шостых класаў можна прапанаваць наступную арфаграфічную хвілінку: *(Р,р)адзіма Беларусь, ф(о,а)таздымак, ра(з,с)гневацца, тры(у,ў)мф, су(м,мм)а, сві(н,нн)ы, камп’ют(э,а)р, вы(-,й)ду, інтэ(л,лл)ект, л(я,е)генда, стэ(п,пь) мы(ш, шь), ф(о,а)таграфія, аб(е,я)ліск, хле(б,п), р(а,э)дкаваты, сне(х,г), лід(э,а)р, бара(дз,ц)ьба, мала(дз,ц)ьба, з(я,е)млякі.* Дэвізам дадзеных заняткаў з’яўляецца прымаўка: *Розум – найлепшае багацце.* Яшчэ гэта прыказка дае магчымасць паўтарыць пунктуацыйнае правіла “Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам”, вывучанае ў пятым класе.

Дэвіз урока можа прапаноўвацца не ў поўным варыянце: дзецям неабходна дапісаць працяг выказвання, абапіраючыся на складзеныя словы. Дзевяцікласнікам можна прапанаваць такі від арфаграфічнай хвілінкі: *Спа(д,т)канне, ф(а,о)таздымак, вы(-,й)ду, ме(н,нь)ш, в(я,е)лікакняжацкі, ку(б,п)ка дрэў, ф(о,а)таграфія, се(м,мь), пад(ы,ый)ду, ка(л,лл)екцыя, н(е,я)стомны, п(е,я)сняры, акрыленас(ц,цц)ю, свежас(ц,цц)ю, дасled(-,а)ваць, (х,к)рышчэнне, запаве(д,т), д(о,а)браўпарадкаваны, гасцін…ы, ран(е,і)шні, лі(ч,дж)ба, св(о,а)еасаблівы, лё(г,х)кі, выс(о,а)камернасць, палымя(н,нн)ы, п(е,я)сняры.* У вучняў з’яўляецца запіс: *“Той не памыляецца, хто нічога не …”*, яны прапануюць варыянты працягу, тлумачаць свой выбар. У выніку атрымліваецца добра вядомая народная мудрасць: *“Той не памыляецца, хто нічога не робіць”.* Дадзеная прыказка – гэта і дэвіз урока, і падказка на тэму, якая будзе разглядацца на гэтых занятках (тэма “Складаназалежны сказ”).

На ўроках беларускай мовы настаўнік павінен прытрымлівацца тэкстацэнтрычнага падыходу. Выйгрышнымі з'яўляюцца тыя заняткі, на якіх новы матэрыял вывучаецца на аснове "лексічнай" тэмы. Вучням пятых класаў падчас вывучэння тэмы "Антонімы" прапануецца тэкст з заданнямі на фарміраванне чытацкай граматнасці (1, 2 заданні), на паўтарэнне пунктуацыйных правіл (3 заданне) :

*Каляды – старажытнае народнае летняе свята, якое адзначаецца праваслаўнымі вернікамі з 6 па 19 студзеня.*

*6 студзеня нашы продкі сустракалі Каляду. У гонар яе ў кожнай хаце ладзілася святая вячэра, на якой абавязковымі стравамі былі куцця і бліны. На стол ставілі многа страў, за што ў народзе гэты вечар называюць "вялікай куццёй". Уся ежа на першую куццю была поснай. Вячэраць пачыналі з узыходам на небе першай ранішняй зоркі.*

*Другая куцця адзначалася на шчодры вечар – 13 студзеня. Гэта абрадавая вячэра вызначалася не толькі багаццем страў, але і вялікай колькасцю поснай ежы – смажанага і вэнджанага мяса, каўбас і іншых прысмакаў, за што другую куццю называюць шчодрай, мясной, беднай.*

*18 студзеня спраўлялі трэцюю куццю, якую называлі "поснай" або "вадапуснай". Гаспадар зачыняў дзверы і праз парог тройчы клікаў: "Мароз, мароз, хадзі куццю есці".*

Заданні:

1. Уважліва прачытайце тэкст, знайдзіце ў ім сэнсавыя памылкі (іх 5), выпраўце іх, пастарайцеся абгрунтаваць свой выбар.
2. Якая інфармацыя пра Каляды падалася вам найбольш цікавай?
3. Патлумачце схемамі пастаноўку знакаў прыпынку ў апошнім сказе апошняга абзаца.

Вучням прапануецца эталон для самаправеркі:

*1. Каляды – старажытнае народнае* ***зімовае*** *свята, якое адзначаецца праваслаўнымі вернікамі з 6 па 19 студзеня.*

*2. Вячэраць пачыналі з узыходам на небе першай* ***вячэрняй*** *зоркі.*

*3–4. Гэта абрадавая вячэра вызначалася не толькі багаццем страў, але і вялікай колькасцю* ***скаромнай*** *ежы – смажанага і вэнджанага мяса, каўбас і іншых прысмакаў, за што другую куццю называюць шчодрай, мясной,* ***багатай.***

*5. Гаспадар* ***адчыняў*** *дзверы і праз парог тройчы клікаў: "Мароз, мароз, хадзі куццю есці".*

На этапе замацавання па гэтай жа тэме пяцікласнікам можна прапанаваць заданне такога тыпу: са слоў скласці сказы, запісаць іх у сшытак, падкрэсліць антонімы: *Ілья жніво* ***пачынае****, а лета* ***канчае.*** *На Радаўніцу* ***раніцай*** *пашуць, па абедзе* ***плачуць****, а* ***вечарам скачуць****. Калі на Вадохрышча* ***мароз*** *і* ***сонца*** *– чакай засушлівага лета.*

Вучням шостых класаў падчас вывучэння тэмы "Правапіс канчаткаў назоўнікаў 2 скланення ў форме роднага склону адзіночнага ліку" прапануюцца прыказкі і прымаўкі з прапушчанымі словамі:

*1. Не шукай лёгкага … . 2. Кожны сам каваль свайго … . 3. Са свайго … спусціш – на чужым не зловіш. 4. Кожная сасна свайму … песню спявае. 5. Бяда … вучыць. 6.З пустога … ніхто не лье.*

У графе "Даведкі" ў пачатковай форме змешчаны словы, якія неабходна ўставіць: *бор, розум, хлеб, шчасце, язык, збан.* Пры ўмове правільнага выканання атрымліваюцца наступныя запісы: *1. Не шукай лёгкага* ***хлеба.*** *2. Кожны сам каваль свайго* ***шчасця****. 3. Са свайго* ***языка*** *спусціш – на чужым не зловіш. 4. Кожная сасна свайму* ***бору*** *песню спявае. 5. Бяда* ***розуму*** *вучыць. 6. З пустога* ***збана*** *ніхто не лье.*

Прыказкі і прымаўкі – гэта яшчэ і прыдатны матэрыял для развіцця звязнага маўлення.

Дастаткова цікавым і карысным відам працы з'яўляецца разгадванне загадак. Вучням шостых класаў на пачатку ўрока прапануецца напісаць адгадкі на наступныя загадкі:

*1. Што на свеце сыцей за ўсё?*

*2. Што на свеце шпарчэй за ўсё?*

*3. Не разыначка я, а мяне ўсе смакуюць, не дзяўчыначка я, а мяне ўсе цалуюць.*

*4. Еду, еду – і ні дарогі, ні следу.*

*5. Што гэта за дарога: хто ідзе, дык кульгае?*

*6. Стаяць слупы бялёныя, на іх шапкі зялёныя.*

*7. Дзе гарады без людзей, а рэкі без вады?*

*8. Бегла свінка, залатая спінка, ільняны хвосцік.*

Атрымаліся такія словы-адгадкі: *зямля, думка, лыжка, лодка, лесвіца, бяроза, карта, іголка, нітка.* Затым вучні называюць прыметы, якія аб'ядноўваюць усе гэтыя словы, і аднаўляюць пропускі ў запісанай на дошцы тэме: *"Правапіс канчаткаў … … скланення ў форме меснага склону адзіночнага ліку".* У сшытку з'яўляецца наступны запіс: *"Правапіс канчаткаў назоўнікаў 1 скланення ў форме меснага склону адзіночнага ліку".*

На этапе падвядзення вынікаў урока можна прапанаваць наступнае заданне: устаўце ў прыказку назоўнік канкрэтнай лексіка-граматычнай групы:

*1. (Канкрэтны назоўнік) моцная крыламі, а чалавек – (абстрактны назоўнік). За багацце (абстрактны назоўнік) не купіш.* Адказы: ***Птушка*** *моцная крыламі, а чалавек –* ***дружбаю****. За багацце* ***розуму*** *не купіш.*(Тэма: "Канкрэтныя і абстрактныя назоўнікі", 6 клас).

*2. Не той друг, хто (рэчыўны назоўнік) мажа, а той, хто праўду скажа. Якое (зборны назоўнік), такое і насенне.* Адказы: *Не той друг, хто* ***мёдам*** *мажа, а той, хто праўду скажа. Якое* ***карэнне****, такое і насенне.* (Тэма: "Зборныя і рэчыўныя назоўнікі", 6 клас).

*3. Які (асабовы назоўнік), такое і гранне. Хто (асабовы назоўнік) і (асабовы назоўнік) зневажае, той дабра не знае.* Адказы: *Які **музыка,** такое і гранне. Хто **бацьку** і **маці** зневажае, той дабра не знае.* (Тэма: “Асабовыя назоўнікі”, 6 клас).

Падчас вывучэння тэмы “Правапіс канчаткаў назоўнікаў 1 скланення ў форме меснага склону адзіночнага ліку (6 клас) можна прапанаваць падобнае да папярэдняга заданне:

*1. Не цані чалавека па твары, а цані па ...(назоўнік 1 скл. у форме М. с. адз.л.). – Не цані чалавека па твары, а цані па **душы**. 2. Дзе розумам не дайду, дык у... (назоўнік 1 скл. у форме М. с. адз. л.) знайду. Дзе розумам не дайду, дык у **кнізе (кніжцы)** знайду.*

Па тэме “Аднародныя члены сказа, знакі прыпынку пры іх” пяцікласнікам прапануецца скорагаворка, у якой неабходна падкрэсліць аднародныя члены сказа і расставіць знакі прыпынку: *Пайшла Поля па полі і паліла памідоры паволі пустазелле парвала палову перакапала потым прысела пірагоў паела песні папела і праз паўгадзіны паціху пабегла і праз плот пералезла і памідоры панесла.* Заўважым, што скорагаворка – гэта адзін са сродкаў трэніроўкі дыкцыі, таму гэты фальклорны жанр можна выкарыстоўваць падчас правядзення фізкультхвілінкі. Перамагае той, хто хутка і правільна прачытае скорагаворку.

Прыдатным матэрыялам для паўтарэння тэм “Зваротак, знакі прыпынку пры ім”, “Афармленне дыялогу на пісьме”, “Складаны сказ” з’яўляюцца такія цікавыя для вучняў другой ступені навучання жанры, як смяшынкі. Прывядзём прыклад наступнага задання: спішыце, раскрыйце дужкі, расстаўце знакі прыпынку.

*Стасік ід...і парашай задачкі па матэматы(ке,цы) (П,п)росі(т, ц)ь сына маці. Стасік уздыхае. (Не) хочаш сынок? Я хачу раша(т,ц)ь але яны (не) хочу(т,ц)ь рашацца (А,а)(д,т)казвае сын.*

Такім чынам, умелае выкарыстанне разнастайнага фальклорнага матэрыялу на розных этапах урока садзейнічае больш паспяховаму засваенню вучэбнага матэрыялу, пашырэнню кругагляду, далучэнню да духоўных набыткаў продкаў, узбагачэнню слоўнікавага запасу, развіццю звязнага маўлення, актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, павышэнню ў іх цікавасці да вучэбнага прадмета і развіццю чытацкай граматнасці.

**Літаратура**

1. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных / У.М Сысоў. – Мінск : Выш. шк., 1997. – 415 с.

2. Цітова, Л.К. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Л.К. Цітова. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – Ч.1. – 160 с. : іл.